**Ігар Пракаповіч: СВІР І СВІРАНЕ**




Сэнс і паходжанне назвы “свір” не вызначаны і па сённяшні дзень, хоць пошукі варыянтаў яе ўтварэння вядуць многія даследчыкі Беларусі, Расіі і іншых краін. Гэта звязана з тым, што найменні з такой топаасновай сустракаюцца на значных абсягах Еўропы. Яшчэ ў 1847 годзе чэшскі навуковец П. Шафарык сведчыў: “Касательно древности и обширности этого названия срав. Свирь, р., в губ. Олонецкой, вп. в Ладогу, также другую в Галиции, впадающую в Днестр, где и селения Swirz, Swirze, Swirskie Hlibowice, в Чехии Swiretice, Swiratice, Swirinič… Неизвестно, от чего их имя происходит, от корня swir (sibilus), или swir (ferus), слав. свиреп?”  Як бачым, даследчык вызначыў тэрыторыю распаўсюджвання тапоніма на вялікім абшары ад Белага мора на поўначы да Чорнага на поўдні. Заўважым, што лацінскае sibilus мае значэнне “свіст, шыпенне”, а ferus – “грубы, дзікі, люты (свирепый)”.

Найбольш значнымі і адметнымі аб’ектамі з такой назвай з'яўляюцца вялікае возера Свір у Мядзельскім раёне, якое па даўжыні (14,1 км) займае другое месца ў Беларусі, і рака Свір на поўначы Еўрапейскай часткі Расіі. Зыходзячы з гэтага, большасць даследчыкаў імкнецца звязаць паходжанне наймення з тэрмінамі, якія характарызуюць вадаёмы. У старажытнасці менавіта па блакітных артэрыях, якія адыгрывалі ролю шляхоў зносін, ажыццяўляліся стасункі ў межах племянных аб’яднанняў і з суседзямі. Таму лагічна, што спачатку назву павінна былі атрымаць рэкі або азёры, а пазней паселішчы, якія паўставалі на іх берагах. Але, думаецца, было шмат выключэнняў з гэтага правіла, у тым ліку і для Свіры.

А паколькі назва выяўна не славянская, то пошукі вяліся і вядуцца ў балцкіх і фіна-вугорскіх мовах. Так, некаторыя навукоўцы лічаць, што яна мае старажытналітоўскія карані і была ўтворана ад літоўскага слова svirus - "хісткі, зыбкі", што нібыта характарызуе багністы характар берагоў. Большасць даследчыкаў схіляецца да думкі, што гэта слова пайшло з фіна-вугорскіх моў. Тым больш, як мы ўжо заўважылі, на поўначы Еўрапейскай часткі Расіі, у арэале пражывання фінскіх плямён вепсаў і карэлаў, ёсць мнагаводная рака з такой жа назвай. Найбольш распаўсюджаная версія выводзіць утварэнне наймення ад фінскага syveri - "паглыбленне", "глыбокае месца ў вадзе", "глыбіня", што дае падставы тлумачыць назву як "глыбокае". Некаторыя даследчыкі расійскай Свіры тлумачаць назву ад вепсаўскага словы "сювярь" – “глыбокае возера”. Так, прафесар фіна-вугорскага мовазнаўства, доктар гістарычных навук А. Папоў упэўнена сцвярджаў: “Как известно, Свир является протоком из Онежского озера в Ладожское, имеющим большую глубину (от 3 до 14 м). Этим и обусловлено её вепсское название Сювярь (Сюверь), что значит просто “глубина”… Таким образом, здесь происхождение названия совершенно прозрачно.”

Гэту версію тлумачэння прыводзіць і беларускі даследчык А. Рагалёў для возера Свір у Мядзельскім раёне, спасылаючыся на публікацыю Р. А. Агеевой “Гидронимия Русского Северо-Запада как источник культурно-исторической информации”. У пацвярджэнне сваёй думкі ён апісвае возера, спрабуючы даказаць сапраўдную “глыбіннасць” гэтага вадаёма.

Аднак, да нашага возера Свір характарыстыка “глыбокае” не зусім падыходзіць, бо найбольшая глыбіня ў ім усяго 8,7 метра. Гэта нямнога, улічваючы, што ў недалёкім Балдуку, што ляжыць на адлегласці дванаццаці кіламетраў у групе Блакітных азёр, ад воднай паверхні да дна 39 метраў. У недалёкай Нарачы – 28 метраў.

Сваю версію паходжання назвы прапанаваў У. Ягораў. Ён лічыць, што найменне “Свір” прыйшло з гоцкай мовы, дзе “sweirei” азначае “слава, гонар”. На аснове гэтага ён асэнсоўвае назву “нешта кшталту Славенкі”.

І тут варта заўважыць, што непадалёку ад возера Свір знаходзіцца яшчэ шэраг водных аб’ектаў з асновай “свір”: азёры Свірнішча, Свірус (у Літве), рака Свіранка. Але ёсць і многа паселішчаў з гэткім жа коранем, для якіх тлумачэнне “глыбіня” ніяк не падыходзіць. Акрамя г.п. Свір і вёскі Засвір у Мядзельскім раёне, маем Свіраны, Свірплішкі, Свірдуны, Свіркі, Свірблеўшчыну ў заходняй Пастаўшчыне, Вялікія і Малыя Свіраны на Астравеччыне, Свірпалішкі на Браслаўшчыне каля Відзаў, два Свіркасы ў Літве на мяжы з Пастаўскім раёнам. Як бачым, у гэтым

арэале на беларуска-літоўскай мяжы назіраецца адметная канцэнтрацыя сугучных найменняў. Асобныя назвы з такой асновай зрэдку сустракаюцца ў іншых рэгіёнах Беларусі, напрыклад, Свіракі (Дубровенскі раён), Свірані (Талачынскі раён), Свіраўшчына (Верхнядзвінскі раён), Свірбы (Лёзненскі раён), Свіркі (Докшыцкі і Міёрскі раёны), Свіршчане (Міёрскі раён).

Наяўнасць значнай колькасці "сухапутных" назваў з асновай "свір" наводзіць на думку, што нарадзіліся яны, верагодна, не ад водных характарыстык і ўтрымліваюць нейкі іншы сэнс. Гэта заўважыў расійскі даследчык санскрыта Я. Львоў: "Памылковасць класічных тлумачэнняў паходжання шматлікіх тапонімаў Расіі і, адпаведна, страта старажытных ведаў добра бачныя на прыкладзе р. Свір. Паводле Я. М. Паспелава, р. Свір на мове вепсаў завецца Süυäri [Сювярь]. У рускіх дакументах XIII-XVII стст. згадваецца ў формах Свер, Сверь, Свіра, і гэта назва ў навуковай літаратуры тлумачыцца па-рознаму: ад süυä [сюва] "глыбокая" і -рь <яр, ярвь "возера"; ад suυara "глыбіня" ці без доказаў тлумачыцца як "глыбокая рака". Такім чынам, прыкмета "глыбіні" прымаецца ўсімі аўтарамі, але поўнае тлумачэнне ўсёй назвы супярэчлівае.

Версія аўтара заснавана на амаль аднолькавым напісанні слоў Suυari і санскрыцкага "işυar" (магутны вар) і, верагодна, больш абгрунтавана… Вар (авестыйскае Вара) – гэта ўмацаваная крэпасць ці замак, які быў сховішчам для людзей, скаціны, раслін і агню падчас зімніх халадоў, снегападаў і паводак. Паводе пададзенага ў Авесце апісання, Вар, пабудаваны Йімам [герой авестыйскага эпаса], складаўся з трох канцэнтрычных колаў сцен, у вонкавым з якіх было дзевяць праходаў, у сярэднім – шэсць і ва ўнутраным – тры. Вар гэты нагадваў, такім чынам, па планіроўцы жытлы-селішчы старажытных арыяў". Далей Я. Львоў паведамляе: "У перакладзе з санскрыта, мовы старажытных арыяў, для слова вар/вара (Uar/Uara) большасць значэнняў звязана з замкнёным сховішчам, абарончым колам."

Такім чынам, прытрымліваючыся гэтай версіі, можна лічыць, што назва Свір пайшла не ад возера, а ад умацаванага селішча старажытных індаеўрапейцаў, якое як раз і размяшчалася на Перуновай гары або гары Баторыя ў цэнтры мястэчка.

А што пра Свір вядома археолагам? Пра даўняе засяленне тутэйшых мясцін людзьмі сведчаць два гарадзішчы, якія былі выяўлены і абследаваны навукоўцамі. Адно з іх мае мясцовую назву Мястэчка і знаходзіцца на паўднёва-заходняй ускраіне паселішча, злева ад дарогі на Смаргонь, на мысе прыроднага ўзвышша, які ўразаецца ў возера Свір. З заходняга боку гарадзішча ўмацавана валам вышынёй 1 - 1,5 метра і ровам шырынёй да 8-10 метраў. Знойдзеная штрыхаваная і

гладкасценная кераміка сведчыць пра тое, што пражывала тут балцкае насельніцтва.

Другое гарадзішча знаходзіцца ў цэнтры Свіры на ізаляваным, з вельмі стромкімі схіламі, ўзгорку, значна частка якога разбурана кар'ерам. Пляцоўка памерамі 12 х 28 метраў (раней яна была ў два разы большая) ўзвышаецца над наваколлем на 12-15 м. Паводле падання, на гэтай гары ў часы паганства знаходзілася капішча Пяруна, на месцы якога нальшчанскі князь Даўмонт у XIII стагоддзі заснаваў замак, які пазней доўгі час належаў князям Свірскім. Руіны былой цвярдыні ў канцы XVI стагоддзя апісаў польскі храніст і паэт Мацей Стрыйкоўскі. У час раскопак, якія правёў у 1976 годзе Я. Звяруга, пад рэшткамі сярэднявечнага замка выяўлены сляды неўмацаванага селішча эпохі ранняга жалезнага веку. Яно не мела земляных абарончых збудаванняў, надзейнай аховай з'яўляліся стромкія схілы ўзгорка. Пасля пабудовы замка гара была абнесена валам вышынёй да 3 метраў.

Сярод рэчаў, якія выявілі археологі, найбольшую группу склалі шматлікія ўпрыгожанні: скроневыя кольцы, пярсцёнкі, бразготкі, спіралькі, бранзалет, падковападобныя фібулы, фрагмент пласціны-накладкі з раслінным арнаментам. Знойдзены таксама жалезныя нажы, наканечнікі стрэл, вісячыя, у тым ліку цыліндрычныя, замкі, шылы, гліняныя і шыферныя праселкі, каменная форма для ліцця, разнастайныя вырабы з косці. Кераміка ніжніх гарызонтаў ляпная (штрыхаваная і гладкасценная), верхніх - ганчарная.

Такім чынам, вынікі археалагічных раскопак сведчаць пра тое, што ў Свіры сапраўды меліся старадаўнія ўмацаванні – тое, што, паводле Я. Львова, адпавядае авестыйскаму “вару”. Але давайце паглядзім, ці ёсць у гэтым рэгіёне назвы паселішчаў з такой асновай-коранем. Аказваецца, ёсць! І многа: Варанец, Варанцы, Варашылкі, Варчышкі, Варагі (Мядзельскі раён), Вараноўка, Вараноўшчына, Варапаева, Варкацішкі, Вароны (Пастаўскі раён), Варапаншчына, Варнэлі, Варнішкі (3 назвы), Вары, Варонішкі, Варонка (Браслаўскі раён), Варгіняй, Варджюкеміс, Варнішке (3 назвы) (Літва). Зразумела, што ў гэтых назвах могуць быць і ёсць выпадковыя гукавыя спалучэнні, якія не звязаны з санскрыцкім “вар”, аднак… Звернем увагу на невялікую вёску Варашылкі, якая знаходзіцца за чатыры кіламетры на паўночны ўсход ад г.п. Свір. Яе адметнасцю з’яўляецца класічная “вяночная забудова”: кожная сядзіба нагадвае невялікую ўмацаваную крэпасць, бо хата, клеці і хлявы ўтвараюць замкнёны чатырохкутнік. Прамежкі паміж пабудовамі закрываюцца глухім бярвенчатым плотам, а патрапіць у двор можна толькі праз веснічкі ў браме. *У экспазіцыйным сектары “Паазер’е” беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту каля Мінска прадстаўлены адрэстаўрыраваны сядзібны двор з вёскі Варашылкі.* Верагодна, гэта і ёсць той

санскрыцкі “вар” - тып забудовы, які дайшоў да нас у зменены форме ад старажытных арыйцаў.

Звернем увагу на тое, што і ў Еўропе, і ў Азіі існуе шмат назваў, якія ўтрымліваюць топаснову “вар”.

Значная канцэнтрацыя аднакарэнных тапонімаў на невялікай плошчы можа сведчыць аб пражыванні тут народа (этнаса), які чымсьці адрозніваўся ад суседзяў. На наш погляд, менавіта на гэтай тэрыторыі знаходзіўся асноўны арэал рассялення племені свіранаў.  Зрэшты, гэта думка была выказана яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя П. Шафарыкам, які пісаў: “Zuireani, Свиряне, жили в окресностях озера, называемого и теперь Свирь, в губ. Виленской, уезде Свенцянском, где находится и селение Свиряны, Свираны, в котором скрывается древнее имя этой ветви“. Да гэтага можна дадаць яшчэ некалькі назваў паселішчаў, якія наўпрост адлюстроўваюць племянное імя: Свіршчане, Свіракі, Свірбы, Свіркасы.

Звернем увагу на амаль поўнае сугучча асноў гэтых назваў са словам “свіран”. Ці ёсць тут якія паралелі, ці гэта выпадковае супадзенне? Аказваецца ёсць, і вельмі глыбокія! Што такое свіран? Тлумачальны слоўнік беларускай мовы падае наступную інфармацыю: “Свіран – халодны будынак, прызначаны для захоўвання збожжа, мукі і іншых прадуктаў, а таксама рэчаў і пад.” Нічога адметнага, будынак як іншыя будынкі на сядзібе. Але гэта цяперашнім часам, калі галоўная пабудова – хата. А раней гэту ролю на сядзібе выконваў як раз свіран. Менавіта ад яго залежаў дабрабыт сям’і, менавіта там захоўвалася ўсё самае каштоўнае.

У Міколы Гусоўскага ў “Песні пра зубра” знаходзім цікавыя радкі, якія пацвярджаюць гэту думку: “Нашы лясы – гэта наша скарбонка і **свіран**, Наша камора жывіцы, і дзёгцю, і ягад, Мёду і воску, куніцы і рознай дзічыны…”

Але не толькі сваёй важнай роляй вылучаецца свіран сярод сядзібных пабудоў – ён мае вельмі адметныя асаблівасці сваёй канструкцыі. Звычайна гэта быў чатырохкутны будынак без вокнаў з невялікімі дзвярыма з моцнымі запорамі, прычым, усе бярвенні падганяліся адно да другога настолькі шчыльна, што не пакідалася ані маленькай шчылінкі. І зразумела, чаму. Бо тут захоўвалася дабро. Гэта быў своеасаблівы “сювярь” – “свяшчэнны вар”, крэпасць, у якой зберагалася будучыня сям’і, роду. Значэнне гэтай пабудовы падкрэслівалася і такой асаблівасцю яе канструкцыі: з бярвенняў складаліся не толькі сцены, але і дах, а падлога клалася з гарбылёў, якія грунтоўна абмазваліся глінай. Цікавым спосабам правяралася шчыльнасць свірна: у складзены чатырохкутны зруб налівалі вады, выяўлялі хібы, даводзілі да ладу, прасушвалі і толькі потым выразалі дзверы.

Размяшчаўся гэты будынак асобна ад іншых пабудоў двара, каб не згарэў у выпадку пажару, і абавязкова на відавоку з хаты, каб можна было ўбачыць злодзеяў, калі тыя пасквапяцца на дабро.

Калі сыходзіць з таго, што “свір” усё ж утварылася ад “Сювяр” (“işʋar”), дзе “вар” – гэта ўмацаванае месца, паселішча, то хацелася б вызначыцца і са значэннем тапафарматы “сю-”, “су-”, “св-”, “шв-“. Паспрабуем пашукаць словы і тапонімы з такім спалучэннем гукаў. І вось што мы маем: свет, светлы, святы, свята, светач, святыня, свяцілішча, свяшчэнны, свядомасць, свабода, сваволле, свастыка, сват, сваяк, сведка, свежы, свечка, світка, свой, свіран, сварка. Як бачым, абсалютная большасць слоў заключае ў сабе станоўчы, узвышаны сэнс. Гэта або характарыстыка вакольнага асяроддзя (свет, свабода, сваволле), або праявы белага колеру, чысціні (светлы, світка, свежы), або ўзровень блізкага сваяцтва (сват, свой, сваяк), або рэлігійна-урачыстыя асаблівасці (святы, святар, свята, свяцілішча, свяшчэнны, светач, свядомасць, святыня). Асабліва звернем увагу на знаходжанні ў гэтым радзе свечкі – сімвала агню, і свастыкі – сімвала сонца. Прыгадайма, што ў беларускай мове “в” даволі часта пераходзіць у “л”. Яскравы прыклад – свабода. Раней у вёсках часта можна было пачуць “слабода”, “слабада”, “слабодны”, што пацвярджаецца вялікай колькасцю паселішчаў з назвамі Слабада і Слабодка. З гэтага вынікае, што да вызначанага раду слоў можна дадаць сланечнік – расліну, сімвал сонца, ды і само сонца, якое раней ужывалася і ў формах “слонка”, “слонейка”, “соўнейка”. Вось прыклады з народных песень:

Ў чыстым полі явор рос,
Там чорт мальцаў за хахол трос.

Ніхай трасець, калоціць,
У іх праўды даходзіць.

У ў мальчыкаў праўдачка,
Як узімку соўнійка.
Або:
На жоўтам пяску, у новам дамку,
У новам дамку чатыры вакны.
Первае вакно – на ўсход соўнійка,
Другое вакно – на паўдзён сонца,
Трэцяе вакно – на захад сонца,
Чацвёртае вакно – сілязню ўляцець…

Усе прыведзеныя факты і разгледжаныя паралелі ў пабудове сугучных слоў і тапонімаў даюць падставы выказаць меркаванне, што назва паселішча Свір утварылася не ад наймення возера, а ад умацаванага паселішча, якое яна і характарызуе: "сювярь" – "свяшчэнны вар". І гэтыя "вары" – вялікія і малыя крэпасці – былі паўсюль, дзе пасяляліся старажытныя арыі. У нашым рэгіёне на мяжы Беларусі і Літвы адно з адгалінаванняў арыйскіх плямёнаў атрымала назву свіране – "тыя, што жывуць у свяшчэнных варах". А як і калі яны прыйшлі і аселі на тутэйшых землях – гэта цікавая тэма далейшых росшукаў, падчас якіх нас чакаюць незвычайныя адкрыцці.

**Звесткі пра аўтара**

**Пракаповіч Ігар Міхайлавіч**, нарадзіўся 9.12.1960 у г. Паставы. Закончыў геафак БДУ і аспірантуру Нацыянальнага Інстытута Адукацыі. Працуе выкладчыкам геаграфіі і астраноміі Пастаўскай гімназіі. Настаўнік вышэйшай катэгорыі.

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Вучонага савета беларускага геаграфічнага таварыства. Пераможца Віцебскага абласнога конкурсу "Настаўнік года-95", рэспубліканскага конкурсу Таварыства беларускай школы "Беларускі настаўнік года 2009", лаўрэат звання "Чалавек года Віцебшчыны 2009", лаўрэат літаратурнай прэміі імя У. Караткевіча (2015), лаўрэат прэміі Спецыяльнага фонду прэзідэнта РБ па сацыяльнай падтрымцы здольных навучэнцаў і студэнтаў (2016).

Аўтар каля 50 краязнаўчых, празаічных і паэтычных кніг.



Вяночны двор у вёсцы Варашылкі (здымак аўтара, І. Пракаповіча)



Гара Баторыя (малюнак з музея Свірскай школы)



Гара Баторыя ў Свіры (здымак аўтара, І. Пракаповіча)



Свірская гара (мал Я. Драздовіча)

**Igar Prakapovich: Svir and Svirians**
***(magazine "CULTURE, NATION", March 2018, issue 21, p.47-55)***

That is an interesting article written by the well-known local historian in Pastavy and Vitebsk region, Igar Prakapovich, dedicated to research the origin of the name of Belarusian town Svir.